# ИСТОРИЯ

*Абаронцам Брэсцкай крэпасці*
*прысвячаецца*

С.Я. Новікаў

## АБАРОНА БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ ЛЕТАМ 1941 ГОДА Ў СВЯТЛЕ НОВЫХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ[1]

Айчыннаму чытачу ўпершыню прадстаўлены крытычны аналіз вынікаў даследавання айчыннымі гісторыкамі асноўных падзей абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 года. У апошнія дзесяцігоддзі ў навуковы ўжытак уведзена нямала новых і прынцыпова важных дакументаў аб баявых дзеяннях на брэсцкім абарончым плацдарме. Дзякуючы гэтаму ўзніклі больш спрыяльныя ўмовы для істотнага паглыблення гістарычных ведаў, напісання на дакументальнай аснове грунтоўных навуковых прац і, у рэшце рэшт, цэласнага асэнсавання не толькі гераічных, але і трагічных старонак гісторыі подзвігу абаронцаў брэсцкай Цытадэлі. Аўтар звяртае ўвагу чытача на важнасць рэканструявання гісторыі тых падзей, абапіраючыся не толькі на традыцыйныя гістарыяграфічныя ацэнкі, але і на факты з пакуль не ўведзеных у шырокі навуковы ўжытак нямецкіх дакументальных крыніц.

Беларуская гістарычная навука заўсёды надавала прыярытэтную ўвагу вывучэнню падзей гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Падаецца, што за 70 гадоў, якія мінулі з пачатку абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., гісторыкам павінна было б хапіць часу для ўсебаковага вывучэння гэтай як трагічнай, так і слаўнай старонкі ваеннай гісторыі. Аднак напісанне гістарычнага даследавання аб абарончых баях на крапасным плацдарме ў тыя летнія дні пакуль застаецца адкрытым пытаннем як для расійскай, так і беларускай гістарычнай навукі [1; 2; 3].

Асабліва відавочным гэта становіцца на фоне таго, што расійскія навукоўцы зрабілі вельмі прыкметныя крокі ў напісанні на сучасным навуковым узроўні "гістарычных даследаванняў (С.С. Смірноў) аб ходзе баявых падзей на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці ў чэрвені 1941 г., разгарнуўшы спецыяльны навуковы дыскурс аб нямецкім штурме і савецкай абароне ў Брэст-Літоўску з мэтай стварэння цэльнай карціны баявых падзей на этапе вядзення шматдзённага штурму і наладжванні арганізаванай абароны крэпасці над Бугам [4; 5; 6].

Вынікі сучаснага навуковага дыскурсу з'яўляюцца актуальнымі не толькі для ваенных гісторыкаў і аматараў гісторыі вайны, але і прыцягваюць увагу шырокай грамадскасці ў кантэксце вырашэння задач па захаванні

---

[1] Тэзісы артыкула былі апублікаваны ў зборніку "Материалы ежегодной научной конференции преподавателей и аспирантов университета". 27–28 апр. 2010 г.: В 5 ч. Ч. 5 / отв. ред. Н.П. Баранова. – Минск : МГЛУ, 2010. – С. 7–12

ваеннага мінулага як трывалага падмурка нацыянальнай памяці. Асаблівую актуальнасць новыя гістарычныя веды маюць для студэнцкай моладзі, якая вывучае дысцыпліну “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (ў кантэксце Другой сусветнай вайны”.

Асноўныя палажэнні навуковай канцэпцыі абароны Брэсцкай крэпасці фарміруюцца ў пачатку 1960-х гадоў. Надзейны падмурак гісторыі гераічнай абароны закладваецца з выхадам калектыўнага зборніка ўспамінаў непасрэдных абаронцаў крэпасці пад назвай “Гераічная абарона” (1-е выданне. Мінск, 1961). Пры адсутнасці дакументальных крыніц сабраныя ў адну кнігу сведчанні сталі практычна першаасновай для аднаўлення агульнай карціны баявых дзеянняў у ходзе легендарнай абароны крэпасці ў Брэсце.

У навуковым аспекце асаблівую значнасць зборніку надаваў уступны артыкул, падрыхтаваны маёрам А.Крупеннікавым – дырэктарам Музея абароны, адкрытым у лістападзе 1956 г. У прадмове да кнігі аўтар дае агульную характарыстыку абароны, вызначае яе храналагічныя рамкі і паказвае колькасныя аспекты абароны на аснове матэрыялаў архіва Міністэрства абароны СССР. Цікавай нам падаецца аўтарская спроба агляду тагачаснай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, асабліва вывад аўтара аб неабходнасці выкарыстання розных дакументальных крыніц, у тым ліку нямецкага паходжання. “Трэба адзначыць, – падкрэслівае Крупеннікаў у прадмове, – што Гшопф (аўтар успамінаў пра 45-ю нямецкую пяхотную дывізію. – С.Н.) у шэрагу выпадкаў дае праўдзівую карціну баявых дзеянняў у Брэсцкай крэпасці” [7, с. 36].

Паводле матэрыялаў прадмовы, абарона Брэсцкай крэпасці падраздзялялася на два перыяды: першы – з 22 чэрвеня 1941 і да канца месяца, калі 29–30 чэрвеня гітлераўцы правялі генеральны штурм крэпасці; другі – з канца чэрвеня да сярэдзіны ліпеня 1941 г. Аўтар перакананы ў тым, што апошнія ачагі абароны знаходзіліся на Цэнтральным і Кобрынскім умацаваннях [7, с. 26]. Спроба праціўніка раптоўным ударам ашаламіць гарнізон крэпасці і з ходу захапіць яе была сарвана : 45-я нямецкая пяхотная дывізія не выканала сваю галоўную задачу – ёй не ўдалося адразу авалодаць крэпасцю і да зыходу дня 22 чэрвеня прасунуцца на рубеж на ўсходзе Брэста. На думку Крупеннікава, у абароне Брэсцкай крэпасці бралі ўдзел 7 стралковых батальёнаў 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій агульнай колькасцю прыкладна 3,5 тысячы чалавек [7, с. 17]. Апрача таго, у прадмове аўтар зазначае, што толькі “далейшае вывучэнне дакументаў праціўніка, без сумневу, дасць яшчэ больш поўныя і каштоўныя звесткі аб баях у крэпасці” [7, с. 29]. Аднак ідэалагізацыя савецкай гістарычнай навукі не дапускала поўнага выкарыстання інфармацыйнага патэнцыялу дакументальных крыніц, таму з’яўлялася галоўнай перашкодай для аб’ектыўнай распрацоўкі ваеннай тэматыкі. На той час аб рассакрэчванні дакументаў прынцыповага значэння, у тым ліку ўсіх матэрыялаў аб абароне Брэсцкай крэпасці, размова ісці не магла.

Аналагічныя высновы па гісторыі гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці былі характэрны для акадэмічных выданняў пачатку 1960-х гадоў [8; 9; 10].

У тагачаснай беларускай гістарычнай навуцы інтэрпрэтацыя асобных фактаў зводзілася галоўным чынам да тэзы аб упартым супраціўленні гарнізона Брэсцкай крэпасці нямецка-фашысцкім войскам: арганізаваная абарона крэпасці вялася да 14 ліпеня, у некаторых яе фартах супраціўленне асобных груп і байцоў не спынялася да 20 ліпеня 1941 г. [8, с. 423]. Асобныя групы абаронцаў працягвалі барацьбу практычна цэлы месяц. Толькі на 32-і дзень вайны, амаль страціўшы прытомнасць, маёр Гаўрылаў быў захоплены ў палон. Стойкая і мужная барацьба гарнізона Брэсцкай крэпасці на працяглы час скавала буйныя сілы нямецкіх войск, якія колькасна значна пераўзыходзілі сілы абаронцаў крэпасці [9, с. 20]. У аснову навуковай канцэпцыі абароны была пакладзена тэза аб 28-дзённай (з 22 чэрвеня па 20 ліпеня 1941 г.) абароне крэпасці Брэст асобнымі падраздзяленнямі савецкіх войск у пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У самой крэпасці 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі супрацьстаялі асобныя падраздзяленні 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій, якія разам з пагранічнікамі складалі гарнізон абаронцаў агульнай колькасцю да 3,5 тысяч чалавек [10, с. 717].

Але вядучую ролю ў зборы, літаратурнай апрацоўцы і выданні матэрыялаў аб абароне Брэсцкай крэпасці на той час адыграў савецкі пісьменнік С.С.Смірноў. Яго дакументальная кніга "Брэсцкая крэпасць", якая ўпершыню выйшла ў свет у 1965 г., знаёміла чытача з рэальнымі падзеямі гераічнай абароны крэпасці летам 1941 г. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці на рубяжы 1960/70-х гадоў была мемарыялізавана ў камні. На думку Р.Аліева, урачыстае адкрыццё на тэрыторыі крэпасці мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой паставіла кропку на вывучэнні гісторыі Брэсцкай крэпасці [1, с. 793].

Такім чанам, тры першых пасляваенных дзесяцігоддзі развіцця савецкай гістарыяграфіі з'яўляліся важным этапам станаўлення навуковай і грамадскай думкі аб гісторыі гераічнай абароны легендарнай Брэсцкай крэпасці. Асновай для адбудовы навуковай канцэпцыі з'яўляліся галоўным чынам факты з успамінаў удзельнікаў абароны. Ва ўмовах абмежаванасці дакументальных крыніц, закрытасці савецкіх і недаступнасці замежных архіўных фондаў менавіта ўспаміны і іх асабістыя дакументы складалі асноўны падмурак для рэканструкцыі баявых дзеянняў у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Зазначым, што на той час гісторыкі абыходзілі маўчаннем многія факты з данясення 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Але звернем увагу чытача на наступны факт: напрыканцы 70-х легендарны абаронца крэпасці Герой Савецкага Саюза П.М. Гаўрылаў, добра ведаючы калектыўныя працы, у тым ліку кнігу С.С. Смірнова, выказваў істотна важную думку аб тым, што для "поўнага і ўсебаковага раскрыцця падзей, звязаных з абаронай Брэсцкай крэпасці, шмат давядзецца зрабіць гісторыкам і навуковым даследчыкам" [11, с. 121].

У далейшых поглядах, падыходах і ацэнках у дачыненні да хода абароны Брэсцкай крэпасці аўтары прац розных жанраў, у тым ліку гістарычных [12], выражалі адметнае адзінства. У канцэптуальным вывучэнні

гэтай тэмы з 1960-х гадоў не назіралася практычна ніякіх зменаў: агульная схема баявых падзей укладвалася ў хрэстаматыйнае апісанне ўпартай і настойлівай абароны шматнацыянальнага гарнізона крэпасці. Да ліку канцэптуальных асноў былі аднесены тэзы аб “арганізаваным характары абароны Брэсцкай крэпасці”, “месячнай абароне гарнізона крэпасці”, “амаль поўнай гібелі абаронцаў крэпасці” і інш.

У 1970-я гады асноўныя палажэнні прынятай у грамадстве і падтрыманай гісторыкамі канцэпцыі знайшлі замацаванне ў 5-цітомным акадэмічным выданні “Гісторыя Беларускай ССР” (Мінск, 1975). Але пры гэтым беларускія гісторыкі змяншалі да 3 тыс. колькасць абаронцаў Брэсцкай крэпасці [13, с. 122]. Двума гадамі пазней у аднатомнай “Гісторыі Беларускай ССР”, падрыхтаванай Інстытутам гісторыі АН БССР, без спасылак на выніку праведзенага навуковага даследавання і без асобных агаворак гэта лічба ўзрастае да 3,5 тыс. чалавек. Без апоры на канкрэтныя дакументы ў працы сцвярджалася, што гітлераўцы нанеслі цяжкія страты гарнізону, але асобныя групы працягвалі супраціўленне амаль месяц [14, с. 371].

Такім чанам, тры першых пасляваенных дзесяцігоддзі развіцця савецкай гістарыяграфіі з’яўляліся важным этапам станаўлення навуковай і грамадскай думкі аб гісторыі гераічнай абароны легендарнай Брэсцкай крэпасці. Асновай навуковай канцэпцыі з’яўляліся галоўным чынам успаміны ўдзельнікаў абароны. Ва ўмовах абмежаванасці дакументальных крыніц, закрытасці савецкіх і недаступнасці замежных архіўных фондаў менавіта ўспаміны і асабістыя дакументы складалі асноўны падмурак для рэканструкцыі баявых падзей гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Зазначым, што гісторыкі абыходзілі маўчаннем многія факты з данясення 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі.

Зазначым, што першай “літаратурнай работай”, у якой упершыню быў услаўлены подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, з’яўлялася кніга савецкага пісьменніка С.С. Смірнова “Брестская крепость” (М., 1964). На той час яна з’яўлялася вынікам дзесяцігадовай працы пісьменніка па скрупулёзным зборы ўспамінаў непасрэдных удзельнікаў абароны, штудзіраванні тысячы адзінак архіўных дакументаў і гістарычнай адбудове асноўных элементаў ходу баявых дзеянняў на абарончым рубяжы ў Брэсце. Аднак аўтар рэальна ацэньваў вынікі сваёй працы, кажучы ў першых радках “адкрытага пісьма да герояў Брэсцкай крэпасці” пра тое, што ў перспектыве яшчэ не толькі з’явяцца аповесці, раманы і паэмы, будуць створаны п’есы і кінафільмы, але і напісаны “гістарычныя даследаванні” аб трагічнай і слаўнай гісторыі барацьбы абаронцаў Брэсцкай крэпасці [15, с. 13]. Але час паказаў, што апошні наказ пісьменніка застаўся пакуль што не выкананым у беларускай гістарычнай навуцы.

У далейшых поглядах, падыходах і ацэнках у дачыненні да гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці аўтары прац розных жанраў, у тым ліку гістарычных, выражалі адметнае адзінства. Звязана гэта было з тым, што прысваенне Брэсцкай крэпасці ганаровага звання крэпасці-герой у пэўнай

ступені затармазіла працэс навуковага асэнсавання гісторыі баявых дзеянняў савецкіх войскаў у ходзе абароны крэпасці. Абарона Брэсцкай крэпасці была кананізаваная як яркі прыклад патрыятызму і масавага гераізму савецкіх воінаў. Пры гэтым агульная схема баявых падзей укладвалася ў хрэстаматыйнае апісанне ўпартай і настойлівай абароны шматнацыянальнага гарнізона крэпасці баявых умацаванняў крэпасці. Да ліку канцэптуальных асноў былі аднесены гістарычныя тэзы аб "арганізаваным характары абароны Брэсцкай крэпасці", "амаль поўнай гібелі абаронцаў крэпасці", "велічным подзвігу абаронцаў легендарнай крэпасці"і інш.

У сярэдзіне 1980-х гадоў галоўныя акцэнты савецкай гістарычнай навукі аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці замацоўваюцца у энцыклапедыі "Великая Отечественная война 1941–1945 гг.". У асобным артыкуле аб абароне задаваліся храналагічныя рамкі абарончых баёў – яны працягваліся з 22 чэрвеня да 20-х чыслаў ліпеня 1941 г.; удзельнікамі гераічнай абароны з'яўляліся падраздзяленні 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій, 17-га пагранатрада і 132-га асобнага канвойнага батальёна войск НКУС агульнай колькасцю каля 3,5 тыс. чалавек. Яны супрацьстаялі сілам 45-я нямецка-фашысцкай пяхотнай дывізіі, патрыманай танкамі, артылерыяй і авіяцыяй. У выніку раптоўнага нападу пераўзыходзячых сіл праціўніка гарнізон Брэсцкай крэпасці ў першыя ж гадзіны вайны апынуўся ў акружэнні. Адносна арганізацыі абароны ў артыкуле сцвярджаецца, што абаронцы стварылі штаб абароны на чале с капітанам І.М. Зубачовым і палкавым камісарам Я.М. Фаміным. Даецца агульная характарыстыка падзей, з якой вынікае наступная паслядоўнасць ходу баявых дзеянняў : баі ішлі на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай крэпасці з 22 чэрвеня да канца месяца, калі гарнізон не толькі адбіваў удары, але і неаднаразова контратакаваў праціўніка. Захоп шматлікіх умацаванняў адбыўся ў выніку агульнага штурму Брэсцкай крэпасці 29–30 чэрвеня. У матэрыяле адзначаецца, што савецкія абаронцы панесці цяжкія страты. З канца чэрвеня да 20-х чысел ліпеня баявыя дзеянні насілі ў асноўным ачаговы характар; невялікія групы савецкіх воінаў укрываліся ў развалінах і сутарэннях Брэсцкай крэпасці, працягвалі ўпартае супраціўленне. У якасці высновы прыводзяцца вывады: 1) абаронцы крэпасці амаль месяц скоўвалі цэлую нямецка-фашысцкую дывізію; 2) большасць абаронцаў пала ў баях, частка прабілася да партызан; 3) частка знясіленых і цяжка раненых абаронцаў траліла ў палон [16, с. 110–111]. Падыход, прадстаўлены ў энцыклапедычным матэрыяле, сведчыў аб замацаванні ў савецкай гістарыяграфіі традыцыйных поглядаў і ацэнак у дачыненні да гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. Зазначым, што ў якасці крыніц для навуковых вывадаў выступалі дакументальная публіцыстыка, матэрыялы "літаратурнай работы" С.С.Смірнова і апублікаваныя ўспаміны ўдзельнікаў абароны. Пры гэтым у спісе выкарыстанай літаратуры не значылася ніводнага спецыяльнага навуковага даследавання. Па гэтай прычыне заставаліся адкрытымі асобныя пытанні, у

тым ліку тыя, якія датычыліся колькасных аспектаў гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці.

Напрыканцы 1980-х гадоў у беларускай савецкай гістарыяграфіі з’явіліся некаторыя новыя акцэнты аб баявых дзеяннях у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. Яны былі расстаўлены ў артыкуле “Абарона Брэсцкай крэпасці 1941”, уключаным у энцыклапедыю “Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.”. У матэрыяле сцвярджалася, што гераічная абарона крэпасці савецкімі войскамі ахоплівае перыяд ад пачатку вайны 22 чэрвеня па канец ліпеня 1941 г. [17, с. 95], калі гарнізон у складзе 3,5–4 тысяч абаронцаў мужна супрацьстаяў сілам 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі агульнай колькасцю каля 17 тысяч салдат і афіцэраў, якая вяла штурм умацаванняў крэпасці ва ўзаемадзеянні з 31-й і 34-й пяхотнымі дывізіямі 12-га армейскага корпуса 4-й нямецкай арміі, 2-й танкавай дывізіяй танкавай групы Гудэрыяна, пры падтрымцы авіяцыі і часцей узмацнення, якія мелі на ўзбраенні цяжкія артылерыйскія сістэмы. Да ліку важных удакладненняў можна аднесці тэзу аб тым, што толькі за 9 дзён абаронцы крэпасці вывелі са строю каля 1,5 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. Канстатуецца, што да канца чэрвеня вораг захапіў большую частку тэрыторыі крэпасці, а на працягу двух дзён 29 і 30 чэрвеня гітлераўцы вялі бесперапынны штурм з выкарыстаннем 500- і 1800-кілаграмовых авіябомбаў. У выніку кровапралітных баёў і вялікіх страт абарона распалася на шэраг ізаляваных ачагоў супраціўлення. Абарона крэпасці з’яўляецца прыкладам мужнасці і стойкасці савецкага народа ў барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы [17, с. 97]. Адметна, што галоўнай крыніцай для падрыхтоўкі артыкула з’яўляліся матэрыялы фондаў і дакументы экспазіцыі мемарыяльнага комплексу Брэсцкая крэпасць-герой.

Іншая трактоўка ходу баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска давалася ў тагачаснай замежнай гістарыяграфіі (Аўстрыі, Германіі, ЗША), у якой аснову даследаванняў складала данясенне камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці абарончага рубяжа Брэсцкай крэпасці [18; 19; 20; 21; 22]. Зразумела, што ў працах замежных даследчыкаў баявыя падзеі ў ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска раскрываліся ў большай ступені з нямецкага, чым савецкага боку. Але замежныя працы ўтрымлівалі цікавыя звесткі па храналогіі нямецкага штурму, аб ходзе баявых дзеянняў на асноўным напрамку наступлення, колькасці патрапіўшых у палон савецкіх салдат і афіцэраў, як і страт з нямецкага і савецкага бакоў.

Зазначым, што “баявое данясенне аб заняцці Брэст-Літоўска”, падрыхтаванае у аператыўным аддзеле штаба 45-й дывізіі 8 ліпеня 1941 г., са значнымі купюрамі ўпершыню было апублікавана роўна праз год пасля пачатку штурму Брэсцкай крэпасці ў газеце “Красная звезда” [23]. Але практычна ўсе прыведзеныя вышэй публікацыі, якія ў савецкіх выданнях адлюстроўвалі ход баявых дзеянняў на тэрыторыі крэпасці, абыходзілі маўчаннем прыведзеныя ў ім факты, асабліва аб савецкіх ваеннапалонных, іх агульнай колькасці і дакладных звестак аб палоне савецкіх абаронцаў і інш.

Зварот да матэрыялаў данясення з’яўляецца адной з важных прыкмет навуковых пошукаў гісторыкаў суверэннай Беларусі [24; 25; 26]. Другой не менш важнай адметнасцю сучаснай беларускай гістарыяграфіі можна назваць тое, што ў аснову новых прац, прысвечаных гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., пакладзены новыя факты, сведчанні і адкрыцці [26]. У першай палове бягучага дзесяцігоддзя брэсцкія даследчыкі падрыхтавалі выданне, у якім упершыню прывялі лічбу аб савецкіх ваеннапалонных, патрапіўшых у нямецкі палон на другі дзень абароны Брэсцкай крэпасці [26, с. 111]. Але аўтары па незразумелых прычынах уводзяць гэты факт з пэўнымі агаворкамі, як быццам бы здача ў палон пярэчыла рэальнаму ходу баявых дзеянняў падчас абароны Брэсцкай крэпасці баявымі часцямі Чырвонай Арміі. Як цяпер вядома з данясення камандзіра 45-й дывізіі аб узяцці крэпасці ў Брэсце, агульная колькасць палонных, якія патрапілі ў нямецкі палон да канца чэрвеня 1941 г. толькі з тэрыторыі крэпасці складае лічбу амаль у 6000 чалавек [3, с. 396]. Аднак гэта лічба пакуль не знаходзіць навуковай ацэнкі ў найноўшых працах [12; 25; 26]. У гэтым плане нам яшчэ больш не зразумела выснова, зробленая ў акадэмічным выданні “Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945» (Мінск, 2005), у якім сцвярджаецца аб тым, што “амаль усе ўдзельнікі (не больш 3 тысяч байцоў) абароны загінулі...” [27, с. 62].

На наш погляд, аб’ектыўнае даследаванне ходу баявых дзеянняў падчас абароны Брэсцкай крэпасці можа весціся з выкарыстаннем максімальна поўнага кола дакументальных крыніц. Патрэбна як мага больш арыгінальных дакументаў для пошуку адпаведных высноў. Таму ў цяперашніх умовах з’яўляецца недапушчальным замоўчванне матэрыялаў, факт існавання якіх даказаны як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіяй. У нашым выпадку гэта – данясенне камандзіра 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі аб узяцці Брэст-Літоўска. Па сённяшні дзень яно не дайшло да беларускага чытача ў поўнай форме, без купюр, выняткаў ці скарачэнняў тэксту. Таму застаецца актуальнай задача па яго ўвядзенні ў шырокі зварот.

Дакумент носіць адметны характар, бо яго выкарыстанне дапамагае ўбачыць рэальную карціну не толькі гераічных, але і трагічных падзей першага месяца Вялікай Айчыннай вайны на Брэстчыне, у рэшце рэшт даведацца аб невядомых па сённяшні дзень фактычных “стратах войскаў, якія абаранялі Брэст” [24, с. 333]. Апрача таго, публікацыя дакумента можа наблізіць чытача да разумення сутнасці прычыны, чаму легендарны абаронца Брэсцкай крэпасці Герой Савецкага Саюза П.М. Гаўрылаў у канцы 1970-х гадоў бачыў патрэбу ў неабходнасці “поўнага і ўсебаковага раскрыцця падзей абароны Брэсцкай крэпасці” [11, с. 121].

Сярод звестак, якія вынікаюць з дакумента, асабліва адметнай з’яўляецца храналогія разгортвання баявых дзеянняў у ходзе ўзяцця абарончага плацдарма крэпасці ў Брэст-Літоўску. Савецкі гарнізон упарта стрымліваў атакі нямецкай пяхоты, мужна трымаючы практычны кожны будынак, кожны каземат, кожны форт. Паводле дакументальных фактаў,

амаль на кожным участку наступлення германскія часці сустрэлі эфектыўна дзеючую агнявую абарону. Разам з тым з данясення вынікае, што пачынаючы з 23 чэрвеня для немцаў сталі адметным фактам савецкія палонныя, агульная колькасць якіх праз 9 дзён баявых дзеянняў значна вырасла ў параўнанні з першай групай палонных чырвонаармейцаў, які патрапілі ў палон вечарам 23 чэрвеня 1941 г., калі з 18.30 на ўчастку (паўночны востраў) наступлення 135-га пяхотнага палка здалося ў палон прыкладна 1900 абаронцаў. На трэці дзень абароны крэпасці 2-гі батальён 133-га нямецкага пяхотнага палка заняў паўднёвы востраў, захапіўшы ў палон 1250 савецкіх абаронцаў. Паводле дакумента, у апошні дзень нямецкага штурму 29 чэрвеня ў палон патрапілі 389 чырвонаармейцаў. Пры гэтым вечарам 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі былі выяўлены "амаль 2000 забітых рускіх" [28, Bl. 1]. Такім чынам, у ходзе гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці пачала пісацца адна з трагічных старонак яе гісторыі, якая па цяперашні час застаецца "белай плямай" у айчыннай гістарыяграфіі. На момант заняцця крэпасці 30 чэрвеня 1941 г. агульную колькасць савецкіх ваеннапалонных (у тым ліку узятых у горадзе), складалі **101** савецкі афіцэр і **7122** малодшыя камандзіры і радавыя [29, Bl, 11]. Падлікі савецкіх воінаў, хто да канца чэрвеня патрапіў у нямецкі палон і забітых на тэрыторыі крэпасці, праліваюць святло на агульную лічбу абаронцаў, якія заставаліся ў крэпасці ў ходзе яе шматдзённай абароны летам 1941 г.

Зазначым, што "Данясенне аб баявых дзеяннях у ходзе ўзяцця Брэст-Літоўска" [29] не замоўчвае тое, што чырвонай ніткай праходзіць праз даследаванні беларускіх навукоўцаў пра баявыя дзеянні абаронцаў Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. : на сваім шляху часці германскага вермахта фактычна з самага пачатку агрэсіі супраць СССР сустрэлі моцны рубеж супраціўлення, на якім мужна стаялі савецкія воіны розных нацыянальнасцей, выконваючы свой свяшчэнны абавязак па абароне савецкай Радзімы.

Дакумент уяўляе значны навуковы інтарэс і дазваляе ў пэўнай ступені папоўніць даследчыцкую базу крыніц па праблеме. Нагадаем, што ў беларускай гістарыяграфіі дакумент з асобнымі купюрамі (пра што не гаварылася ў тэксце) быў упершыню надрукаваны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы "Памяць" (Брэст. Кн. 1. – Мінск, 1997). Тэкст падрыхтаваны да друку на аснове арыгінала, выяўленага аўтарам артыкула ў Федэральным ваенным архіве Германіі ў Фрайбургу (зямля Бадэн-Вюртэмберг). Пераклад зроблены без купюр. Адметнасцю з'яўляецца толькі нумарацыя вайсковых часцей, у якой рымскія абазначэнні, праз якія ў дакуменце зафіксаваны нумары германскіх вайсковых падраздзяленняў, перадаюцца арабскімі лічбамі.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Асташин, Н.А.* Брестская крепость / Н.А. Асташин // Великая Отечественная война: Энциклопедия. – М., 2010. – С. 91–93.

2. Новікаў, С. Абарона Брэсцкая крэпасці летам 1941 года / С.Новікаў // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 88–97.
3. *Новікаў, С.* Абарона Брэсцкая крэпасці : традыцыйнае і новае ў гістарыяграфіі / С.Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 6. – С. 28–35.
4. *Алиев, Р.* Брестская крепость : взгляд с немецкой стороны / Р.Алиев // Фронтовая иллюстрация. – 2003. – № 5. – С. 1–74.
5. *Алиев, Р.В.* Штурм Брестской крепости / Р.В. Алиев. – М., 2008.
6. *Алиев Р.В.* Брестская крепость. Воспоминания и документы / Р.В. Алиев. – М., 2010.
7. Героическая оборона. – 2-е изд., доп. – Минск, 1963.
8. История Белорусской ССР. В 2 т. Т. 2. – Минск, 1961.
9. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941– 1945. В 6 т. – Т. 2. Отражение советским народом вероломного нападения фашистской Германии на СССР. Создание условий для коренного перелома в войне (июнь 1941 – ноябрь 1942). – М., 1961.
10. Советская историческая энциклопедия. В 12 т. Т. 2. – М., 1962.
11. *Гаврилов П.М.* Сражается крепость / П.М. Гаврилов. – Изд. 2-е, испр. и док. – Краснодар, 1980.
12. *Бешанов В.В.* Брестская крепость / В.В. Бешанов. – Минск, 2004, 2009.
13. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. – Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – Мінск, 1975.
14. История Белорусской ССР. – Минск, 1977.
15. *Смирнов С.С.* Брестская крепость / С.С. Смирнов. – М., 2010.
16. Брестская крепость // Великая Отечественная война 1941–1945 : энциклопедия / Гл. ред. М.М. Козлов. – Редкол. : Ю.Я. Барабаш, П.А. Жилин (зам. гл. ред.), В.И Канатов (отв. секретарь) и др. – М., 1985. – С. 110–111.
17. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыклапедыя; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 1990.
18. *Gschöpf R.* Mein Weg mit der 45. Infanterie-Division / R. Gschöpf. – Linz, 1955.
19. *Carell P.* The Foxes of the Desert / P. Carell. – New York, 1961.
20. Das Deutsche Reich und der Zweiter Weltkrieg. Bd. 4 : Der Angriff auf die Sowjetunion / hrsg. vom Militärgeschichtlichen Forschungsamt. – Stuttgart, 1983.
21. *Карель П.* Восточный фронт. Кн. 1 : Гитлер идет на восток. От «Барбароссы» до Сталинграда / П. Карель. – М., 2008.
22. *Hartmann Ch.* Wehrmacht im Osten. Front und militärisches Hinterland 1941/42 / Ch. Hartmann. – München, 2009.
23. *Толченов М.* Год тому назад в Бресте // М. Толченов. – Красная звезда. – 21 июня 1941.
24. Памяць: Гіст.–дакум. хроніка Брэста. У 2. кн. – Мінск, 1997. – Кн. 1.
25. Брестская крепость…=Brest fortress… : Факты, свидетельства, открытия / В.В. Губаренко и [др.]. – Брест, 2001.

26. Брестская крепость на ветрах истории / под ред. В.В. Губаренко, Л.А. Цуприка; Авт. концепции и текста А.М. Суворов. – Брест, 2004.
27. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А.А. Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко и др. – Минск, 2005.
28. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей – BA-MA). RH 26–45/27: Bericht der 45. Division (Ia) an A.O.K.4/O.Qu. v. 29.06.1941.
29. BA-MA. RH 26–45/27: Gefechtsbericht über die Wegnahme von Brest-Litowsk v. 8.07.1941.

45-я дывізія[**] Штаб дывізіі, 8.07.1941 г.

Данясенне аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска[***]

Задача дывізіі па ўвядзенні сіл і плану артылерыйскага агню для ўзяцця крэпасці Брэст-Літоўск вынікае з загадаў па дывізіі і артылерыі (гл. дадаткі)[****].

22.6. План артагню ў ходзе нападу быў разлічаны не столькі на фактычнае дзеянне, колькі на ашаламленне. Так стала, бо артылерыйскае аснашчэнне дывізіі нягледзячы на шматразовыя заяўкі было недастатковым, таму было немагчыма правесці працяглую артылерыйскую падрыхтоўку, калі павінна было садзейнічаць маральнае ўздзеянне агню цяжкіх мінамётаў. Паколькі цяжкія мінамёты павінны былі стаяць у поўнай баявой гатоўнасці амаль на адкрытых агнявых пазіцыях (дальнасць стральбы !), то было неабходна, каб яны ўступалі ў дзеянне адразу з пачаткам аперацыі, а пяхота, выкарыстоўваючы агонь мінамётаў, атакавала б праз некалькі хвілін пасля прызначанага часу Х. Спачатку было б пажадана правесці працяглую артылерыйскую агнявую падрыхтоўку і толькі потым увесці ў дзеянне мінамёты; з-за небяспекі агнявога процідзеяння з боку праціўніка, што магло прывесці да вываду са строю мінамётаў і старты боезапасаў, прыйшлося адмовіцца ад гэтай думкі.

[**] З мая 1941 г. камандзірам дывізіі з'яўляўся 48-гадовы генерал-маёр Фрыц Шліпер. У 1912 г. атрымаў званне лейтэнанта. У міжваенны перыяд камандаваў артылерыйскім палком і артылерыйскім корпусам. У верасні 1939 г. палкоўнік Шліпер выконваў абавязкі начальніка штаба 13-га армейскага корпуса, з 23 кастрычніка – начальнік штаба пагранічнай паласы групы армій "Цэнтр". 1 лістапада назначаецца обер-кватэрмайстрам 18-й арміі з аднаачасовым прысваеннем звання "генерал-лейтэнант". У лістападзе 1940 г. быў залічаны ў рэзерв камандуючага склада галоўнага камандавання сухапутных сіл вермахта // Аиев Р. Штурм Брестской крепости / Р. Алиев. – М., 2008. – С. 81–82.

[***] У айчыннай гістарыяграфіі вядома пад рознымі назвамі, у тым ліку: Баявое данясенне камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнанта Шліпера // Памяць: Гіст.–дакум. хроніка Брэста. – У 2 кн. – Мінск, 1997. – Кн. 1. – С. 396; Баявое данясенне аб заняцці Брэст-Літоўска // Героическая оборона. – 2-е изд., доп. – Минск, 1963. – С. 11; Справаздача аб узяцці Брэст-Літоўска // Аиев Р. Штурм Брестской крепости.., – С. 782.

[****] У дакуменце адсутнічаюць.

Тое, што цяжкія мінамёты не здолелі разбурыць сутарэнні і сховішчы, было вядома, і неаднаразова падкрэслівалася камандзірам дывізіі як найбольш слабы бок артылерыйскага ўздзеяння.

Размеркаванне агню мінамётаў прыблізна адпавядала прапанове камандзіра 4-га хімічнага палка асобнага прызначэння. Аднак насуперак гэтаму камандзір дывізіі аддаў распараджэнне аб больш масіраванай канцэнтрацыі агню на цэнтральным востраве.

Спачатку артылерыйскае ўзбраенне дывізіі ўключала апрача дывізійнай артылерыі (9 лёгкіх і 3 цяжкіх батарэй) толькі цяжкія мінамётныя батарэі (9 батарэй з 2880 выстраламі) і дзве 60 см [600 мм. – С.Н.] гарматы, рабіўшых адзін стрэл на працягу пяці хвілін. З-за абмежаванай сферы дзеяння апошнія маглі выкарыстоўвацца ў ходзе атакі толькі на працягу кароткага адрэзку часу.

Просьбы з абгрунтаваннямі аб узмацненні артылерыі пры асабістым уздзеянні генерал-лейтэнанта Хайнемана, камандзіра 302-га зенітнага артылерыйскага палка, у рэшце рэшт далі свае вынікі: было дададзена 9 марцір з мінімальнымі штатнымі разлікамі, на аснове якіх дывізія ўласнымі сіламі ў апошнія дні перад наступленнем стварыла добры дывізіён марцір. Для ўпраўлення агнём артылерыі дадаецца камандзір 27-га артылерыйскага палка, добра зарэкамендаваўшы сябе ў цяжкія дні штурму ў справе ўпраўлення агнём.

Апрача таго, камандуючы 12-м армейскім корпусам загадаў у першыя пяць хвілін наступлення сканцэнтраваць на крэпасці агонь двух дывізіёнаў марцір 34-й і 31-й дывізій; але гэтага ўзмацнення было недастаткова.

22.6. Ашаламленне рускіх артагнём і вельмі імклівае разгорнутае наступленне пяхоты прынесла папярэдне наступныя вынікі:

1. Чыгуначны мост цераз р. Буг быў узяты раптоўным налётам; выбуховыя рэчывы былі выдалены. Гэты і наступны невялікі чыгуначны масты былі ўзяты пад ахову. Стаў магчымы пераход войск па чыгуначным мосце.

2. Праз наступленне 130-га палка на поўдзень ад крэпасці і горада Брэст-Літоўск у першай палове дня былі ўзяты непашкоджанымі масты цераз Мухавец на паўднёвы захад і паўднёвы ўсход ад горада, асабліва важныя для танкавай магістралі № 1. Штурмавыя лодкі 81-га сапёрнага батальёна, якія прабіліся ўверх па цячэнні, хутка пераадолелі супраціўленне праціўніка. Масты былі ўтрыманы нягледзячы на контратакі рускіх танкаў. Пры гэтым 12 рускіх танкаў былі знішчаны ўзмоцненым 130-ы пяхотным палком.

3. Мост цераз Буг на паўднёвым краю цытадэлі здолелі аднавіць раней; апрача таго, 81-ы сапёрны батальён пабудаваў пад агнём праціўніка 8-тонны часовы мост на паўночным краю цытадэлі.

Даволі хутка (прыблізна ў 5.30–7.30) стала відавочным, што ў тыле нашых наступаючых рот рускія прайшлі ў сябе, і з выкарыстаннем стралковай зброі і пры падтрымцы 35–40 танкаў і разведвальных бронемашын, якія знаходзіліся ў крэпасці, распачалі абараняцца асабліва

стойка і ўпарта. Нараду з масіраваным агнём яны дэманстравалі майстэрства снайпераў, маланкавую дзейнасць стралкоў са слыхавых вакон і сутарэнняў, што хутка прывяло да значных страт у складзе афіцэраў і унтэр-афіцэраў. Страх, быць расстраляным у выпадку палону, чаму салдат вучылі камісары, садзейнічаў рашэнню кожнага абараняцца да канца.

У першай палове дня стала ясна, што артылерыйская падтрымка пры бліжнім баі ў крэпасці немагчыма, паколькі наша пяхота даволі блізка мяжуецца з рускімі. Да таго ж рубеж, на якім вёўся бой, было вельмі цяжка вызначыць з-за хаатычнасці пабудоў, хмызняку, дрэў, абломкаў. Наша пяхоты была часткова блакіравана рускімі ачагамі супраціўлення. Апынуліся марнымі спробы асобных пяхотных і процітанкавых гармат, а таксама лёгкіх палявых гаўбіц весці агонь прамой наводкай. Прычынай гэтаму было недастатковае назіранне і небяспека паражэння сваіх байцоў. Да таго ж збудаванні і тоўстыя сцены крэпасці не паддаваліся разбурэнню.

Па тым жа прычынам амаль ніяк не садзейнічаў агонь батарэі штурмавых гармат, якую камандзір 135-га пяхотнага палка ўласным рашэннем падпарадкаваў у другой палове дня.

Увядзенне ў бой новых сіл 133-га пяхотнага палка (да гэтага знаходзіўся ў рэзерве корпуса) на паўднёвым і заходнім астравах у 13.15 таксама не прывяло да нейкіх зменаў у становішчы: там, дзе рускія былі адкінуты ці выкураны, праз некаторы прамежак часу з сутарэнняў, дамоў, вадазборных труб і з іншых укрыццяў з’яўляліся новыя сілы, якія стралялі настолькі выдатна, што нашы страты павялічваліся.

Для знішчэння рускіх танкаў, якія маглі б прарвацца з крэпасці ў напрамку горада, і для ачысткі часткі горада на поўнач ад паўночнага вострава ў раён чыгуначнага дэпо (на паўночны захад ад г. Брэст-Літоўск) быў уведзены 45-ы процітанкавы знішчальны дывізіён (без адной роты, якая знаходзілася ў распараджэнні 130-га пяхотнага палка). Тут дывізіён меў больш магчымасцей для трапнага вядзення агню па рускіх танках.

Каля 13.50, падчас знаходжання ў 135-м пяхотным палку, камандзір дывізіі ў выніку асабістага назірання пераканаўся ў тым, што звычайнымі пяхотнымі ўзбраеннямі крэпасць не ўзяць. Каля 14.30 ён вырашае адцягнуць уласныя сілы з тым, каб яны акружылі крэпасць з усіх бакоў, а потым (магчыма на досвітку 23.6) пачаць дбайна адкарэкціраваную артылерыйскую падрыхтоўку, якая павінна вымотваць і знішчаць рускіх. У 18.30 гэта рашэнне было ўхвалена камандуючым 4-й арміяй, які таксама хацеў пазбегнуць непатрэбных страт; з гэтага часу быў магчымы рух па шашы і чыгунцы, патрабавалася толькі прыкрыць магістралі ад уздзеяння праціўніка, а ўсіх тых, хто застаўся ў крэпасці, марыць голадам.

Вечарам 22.6 паступілі загады аб адводзе войск і блакіраванні крэпасці : 133-і пяхотны полк з 1-м (горад Брэст) і 2-м дывізіёнамі 98-га артылерыйскага палка – з захаду, поўдня і ўсходу; 135-ы пяхотны полк з 3-м дывізіёнам 98-га артылерыйскага палка з поўначы, пераважна па знешняму валу.

Для вядзення агню на разбурэнне дывізіі быў падпарадкаваны маларухомы 854-ы марцірны дывізіён (12 гармат), які займаў пазіцыі ў раёне Карошчына. Таксама былі дададзены 3 стацыянарныя марціры (знаходзіліся ў распараджэнні 34-й дывізіі), якія, аднак не маглі выкарыстоўвацца з-за недахопу баявога персаналу і сродкаў сувязі; але боезапасы былі завезены і выкарыстоўваліся для ўзмацнення агню.

23.6. Уначы падраздзяленні 133-га і 135-га пяхотных палкоў, якія пранiклі ў крэпасць, па загаду былі адведзены назад на блакіруючую лінію. Непажаданым стала тое, што рускія ў той жа час занялі пакінутыя пазіцыі, а таксама тое, што група нямецкіх салдат (пяхота і сапёры, колькасць якіх пакуль дакладна невядома) засталася заблакіраванай у царкве (цэнтральны востраў); час ад часу з імі падтрымлівалася сувязь. Між іншым з імі было некалькі рускіх палонных.

З 5.00 на цэнтральны востраў і на паўднёвы край паўночнага вострава пачаўся карэкціруемы абстрэл, які чаргаваўся агнём цяжкіх гармат для разбурэння ўмацаванняў і моцнымі агнявымі налётамі. У час артагню актыўнасць рускіх снайпераў змяншалася, а пры спыненні абстрэлу настойліва і паспяхова аднаўлялася зноў; распазнаць удала замаскіраваных стралкоў было вельмі цяжка.

Прыкладна каля 9.00 ад камандавання 4-й арміі прыбыла раней абяцаная прапагандысцкая аўтамашына з дынамікам, праз якую трэба было растлумачыць рускім бессэнсоўнасць супраціўлення і заклікаць іх здавацца ў палон. Нягледзячы на гэта дывізія паспрабавала выкарыстаць танкі, якія праходзілі міма, паколькі было ясна, што толькі пры іх дапамозе можна заняць астравы, пазбягаючы пра гэтым дарэмных страт.

Між тым працягваўся планамерны абстрэл крэпасці з мэтай разбурэння ўмацаванняў. Да 14.00 на камандны пункт дывізіі прыбылі адразу малы, а потым вялікі прапагандысцкія аўтамашыны; пасля падрыхтоўкі падыходзячага тэксту іх накіравалі ў адпаведнасці з пануючым напрамкам ветру ў 135-ы пяхотны полк (паўночны востраў), і там, пасля таго, як з 17.00 да 17.15 быў праведзены моцны артналёт, яны павінны былі пачаць заклікаць рускіх здавацца ў палон у дакладна вызначаны тэрмін у 1,5 гадзіны.

На самой справе, калі агонь быў раптоўна спынены, з 18.30 здалося ў палон каля 1900 рускіх. Складвалася ўражанне, што воля рускіх да супраціўлення істотна аслабела, што ў выніку працягу абстрэлаў у спалучэнні з артылерыйскім агнём крэпасць можа пасці без далейшых страт. Таму вечарам адна агітацыйная аўтамашына бала адаслана ў 133-і пяхотны полк (паўднёвы востраў), каб там таксама заклікаць да здачы ў палон. Аднак тут прапаганда не дала вынікаў, паколькі з надыходам цемнаты рускія рабілі некалькі спроб прарвацца ў напрамку горада на паўночны-ўсход і на ўсход, і гучнагаварыцель заглушаўся вельмі моцным артылерыйскім і загараджальным агнём з усіх бакоў.

24.6. Пасля начных спроб прарыву і моцнага агню рускіх стала відавочна, што ў палон здалося толькі некалькі з нежадаючых ваяваць

падраздзяленняў, а іншыя часці, якія поўныя рашучасці весці барацьбу далей, адмовіліся ад капітуляцыі. Па выказваннях палонных, гэта былі камандзіры і камісары, якія часткова самі давалі пісьмовыя абавязацельствы па вядзенні супраціву да апошняга, ці ўтрымлівалі сваіх салдат ад здачы ў палон пад пагрозай расстрэлу ці запалохваннем аб тым, што немцы расстраляюць іх у любым выпадку.

Камандзір дывізіі вырашыў для забеспячэння бесперапыннага руху па магістралі і чыгуначным мосце зноў аднавіць абстрэл крэпасці, пры гэтым запаволены разбуральны артылерыйскі агонь павінен змяняцца масіраваным артагнём. У перапынках паміж абстрэлам па радыё павінны перадавацца заклікі да здачы ў палон, каб зламаць волю рускіх да супраціўлення.

Гэта рашэнне знайшло ўхваленне з боку начальніка штаба камандавання 4-й арміі, які спасылаўся на пажаданне камандуючага марна не праліваць крыві, а толькі забяспечыць бесперапынны рух па танкавай магістралі.

Рашэнне аб працягу артылерыйскага агню далося даволі цяжка, паколькі ў царкве яшчэ знаходзіліся свае акружаныя, якія пры аднаўленні радыёсувязі заклікалі аб аказанні дапамогі. Каб зменшыць страты, раён абстрэлу вакол царквы быў абмежаваны і адмаўлялася ў выкарыстанні цяжкіх мінамётаў, якія стаялі на баявых пазіцыях з амаль 150 снарадамі. У першай палове дня ў палон здалося некалькі рускіх.

З 11.30–11.45 быў прадугледжаны новы моцны артылерыйскі налёт з яго часовым прыпыненнем і заклікам праз гучнагаварыцель да здачы ў палон. Незадоўга да гэтага ўдалося ўстанавіць сувязь з акружанымі ў царкве, у выніку чаго стала вядома, што там трымаецца яшчэ мінімум 50 крайне вымучаных і раненых салдат. У гэтай сувязі даволі хутка было вырашана, са спыненнем прапагандысцкай акцыі і артылерыйскага агню ў 11.45 хуткім кідком штурмавога падраздзялення 133-га пяхотнага палка прарвацца да царквы і выратаваць акружаных.

З выкарыстаннем асабліва моцнага агнявога ўдару 133-му палку ўдалося на працягу 11.30 – 11.45 вызваліць каля 50 акружаных, і адначасова заняць цэнтральны востраў, за выключэннем некалькіх дамоў; 135-ы пяхотны полк займае заходнюю частку паўночнага вострава, крыху пазней 2-гі батальён 133-га пяхотнага палка займае паўднёвы востраў; у палон патрапілі 1250 рускіх.

Ачагі рускага супраціўлення засталіся ў асобных часцях дамоў і ў гэтак званым "доме афіцэраў" на цэнтральным востраве, усходняя частка паўночнага вострава (на ўсход ад дарогі з поўначы на поўдзень) – унутры вала каля паўночнага моста (умацаванне 145) і ўсходні форт.

Пры занятці цэнтральнага вострава рускія сіламі прыкладна да адной роты паспрабавалі ў другой палове дня прарвацца на ўсход па мастах праз Мухавец на магістралі № 1, але былі ліквідаваны. Актыўны агонь рускіх з ачагоў супраціўлення даваў падставы меркаваць, што ўначы яны зноў паспрабуюць вырвацца. Таму для прыкрыцця слабага месца ў кальцы акружэння паміж 135-м пяхотным палком і 3-м батальёнам 133-га пяхотнага

палка быў выстаўлены яшчэ 45-ы разведвальны батальён. На справе рускіх пехацінцы і танкі спрабавалі прарвацца, але сустрэлі адпор.

Камандны пункт дывізіі панесены з Цярэспаля ў Брэст-Літоўск.

25.6. З раніцы працягвалася ліквідацыя ачагоў супраціўлення, прычым для зачысткі паўночнага вострава камандзіру 135-га пяхотнага палка для гэтых мэтаў былі прыдадзены дадаткова 2-і батальён 130-га пяхотнага палка і 45-ы разведвальны батальён з трэцім батальёнам 133-га пяхотнага палка. Выкарыстанне артылерыі стала немагчымай з-за абмежаванага раёну дзеяння. Прымяненне пяхоты было цалкам марным для штурму моцных сцен, поспех магло б прынесці выкарыстанне цяжкіх танкаў ці штурмавых гармат, якіх не было ў наяўнасці. Адзін з дзеючых агнямётаў 81-га сапёрнага батальёна не мог наблізіцца да дамоў без танкавай падтрымкі. Таму дывізія паспрабавала падрыхтаваць для гэтага некалькі трафейных рускіх танкаў, што магло быць завершана 26.6. Апрача таго, па загаду камандавання 4-й арміі дывізіі быў падпарадкаваны 28-ы танкавы ўзвод (3 французскіх танкі Самуа); іх выкарыстанне чакалася не раней за 26 чэрвеня.

Каб не дапусціць флангавага агню з "афіцэрскага дома" на цэнтральным востраве ў напрамку паўночнага вострава, што вяло б да адмоўных наступстваў, 81-му сапёрнаму батальёну была пастаўлена задача па падрыве гэтага дому і ачыстцы астатніх частак тэрыторыі. З даху дома была апушчана ўзрыўчатка, якую падарвалі на ўзроўні аконных праёмаў; пачуліся крыкі і стогны параненых, але рускія працягвалі страляць. Такім чанам, дзень прайшоў у пастаянных бліжніх баях і падрыхтоўцы танкаў.

26.6. На цэнтральным востраве 81-ы сапёрны батальён правёў раней падрыхтаваны моцны ўзрыў дома, метровая цагельная кладка была разбурана, дзе ўзялі ў палон 450 чалавек, якія належалі да камуністычнай школы камандзіраў. Гэтым была ліквідавана магчымасць флангавага абстрэлу праціўнікам паўночнага вострава. Адсюль трэба праводзіць ачыстку паўночнага вострава настолькі, каб адзіным ачагом супраціўлення заставаўся ўсходні форт; пяхота са сваім узбраеннем да яго не магла наблізіцца, паколькі моцны вінтовачны і кулямётны агонь з глыбокага рова з шматлікімі капанірамі і з падковападобнага двара скошваў кожнага, хто набліжаўся.

Заставалася толькі адно : прымушаць рускіх да капітуляцыі голадам, і, перш за ўсё, смагай, а таксама выкарыстоўваць усе сродкі, якія паскаралі іх знясільванне – пастаянна турбуючы агонь цяжкіх мінамётаў дзеля таго, каб перашкаджаць праціўніку перасоўвацца па акопах ці па двары, прамы абстрэл з танкаў, патрабаванні (мегафон) да здачы ў палон, раскідванне лістовак у акопы з верхняга краю і інш. Французскія і рускія танкі яшчэ не былі гатовы да выкарыстання.

27.6. Ад перабежчыка з усходняга форта даведаліся, што там вядуць абарону каля 20 афіцэраў і 370 байцоў з адным чатырохствольным кулямётам, 10 ручнымі кулямётамі, 10 аўтаматамі, 1000 ручнымі гранатамі, дастатковай колькасцю боезапасаў і харчавання. Вады не хапала, аднак яе атрымлівалі з вырытых ям. У форце таксама знаходзяцца жанчыны і дзеці.

Душой супраціўлення быццам бы з’яўляюцца маёр і камісар, асноўныя сілы акружаных належаць да 393-га зенітнага дывізіёну (42-я дывізія).

Нарэшце каля паўдня мог быць выкарыстаны французскі танк Самуа (два танкі 28-га танкавага ўзвода не былі на ходу) і адзін рускі трафейны танк (другі не ўдалося адрамантаваць з-за частых паломак матора). Ад іх агню па байніцах і вокнах рускія значна сцішыліся, але поспеху не бачылася.

Далей была адрамантавана пашкоджаная ў першы дзень на паўночным востраве штурмавая гармата (быў выпраўлены часткова выдалены замок): яе падрыхтавалі да перавозкі, даставілі боезапасы. Ліквідаваліся рэшткавыя ўчасткі супраціўлення (асобныя рускія байцы зноў і зноў стралялі з недасягальных укрыццяў як памыйныя ямы, сметнікі і г.д.). З усходняга форта ўсё яшчэ стралялі.

28.6 Працягваўся абстрэл усходняга форта з танка і аднаўленай штурмавой гарматы, але беспаспяхова. Абстрэл 8,8 см [88 мм. – С.Н.] зенітнай гарматай таксама не прынёс вынікаў. Таму камандзір аддаў распараджэнне ўстанавіць сувязь з лётчыкамі на аэрадроме Малашэвічы, каб высніць магчымасць для бамбардзіровак. Высветлілася, што бомбы скідваць можна, але для гэтага неабходна адвесці ўласныя сілы за знешні вал і да заходняга форта. Адыход праводзіўся ў другой палове дня пад пільным агнявым прыкрыццём з тым, каб рускія не прарваліся з усходняга форту. На жаль, надыходзячая густая хмарнасць зрабіла немагчымай правядзенне бамбардзіроўкі 28.6. Зноў было аднаўлена шчыльнае кальцо ўсходняга форту; уначы для асвятлення гэтага форту былі выкарыстаны рускія пражэктары (часткова з аўтамабільных фар).

Рускія ўсё яшчэ адказвалі на кожнае неасцярожнае набліжэнне.

Сілы, уведзеныя для заняцця крэпасці, былі зменшаны, каб даць хоць асобным часцям неабходны адпачынак.

29.6. З 8.00 лётчыкі скінулі некалькі 500-кг бомб, якія не прывялі да адметнага выніку.Такім жа безвыніковым апынуўся інтэнсіўны артабстрэл усходняга форту танкамі і штурмавымі гарматамі, нягледзячы на тое, што былі разбураны асобныя мураваныя сцены.

На 30.6 рыхтавалася атака з выкарыстаннем бензіну, нафты і змазачных рэчываў, якія павінны скочвацца ў бочках і ёмкасцях у акопы форту і падпальвацца ручнымі гранатамі ці запальваючымі кулямі.

У другой палове дня авіяцыя паўтарыла бамбардзіроўку 500-кг бомбамі. Калі пры гэтым была скінута 1800-кг бомба, якая патрапіла ў рог траншэйнай муроўкі, і ад дэтанацыі якой задрыжэў нават горад Брэст, рускія змякчыліся. Спачатку выйшлі жанчыны і дзеці, а вечарам здаліся ў палон 389 чырвонаармейцаў, якія атрымалі ад свайго камандзіра, маёра, дазвол на здачу ў палон. Палонныя не былі ашаломлены, выглядзелі дужымі і не галоднымі, уражвалі сваёй дысцыплінаванасцю. Маёр і камісар не былі выяўлены, яны магчыма застрэліліся.

30.06. Раніцай усходні форт быў цалкам абшуканы, былі падабраны асобныя параненыя рускія і забітыя немцы, якія там ляжалі. Знойдзена

значная колькасць боезапасаў. Некалькі неабшуканых памяшканняў былі спалены.

На працягу аперацыі камандаванне магло карыстацца разам з радыёсувяззю таксама і праводнай сувяззю, якую выдатна забяспечваў 65-ы батальён сувязі насуперак шматлікім водным перашкодам і пастаяннаму варожаму агню.

Вынікі цяжкіх баёў дывізіі з 22 па 29.6.41 вызначаюць:

1) Крэпасць і горад Брэст-Літоўск узяты; разам з гэтым забяспечана магчымасць руху па важных шляхах дастаўкі: танкавай магістралі № 1 і чыгунцы Варшава – Брэст-Літоўск на ўсход.

2) Знішчаны асноўныя сілы дзвюх рускіх дывізій (6-й і 42-й).

Трафеі складаюць:

а) зброя: 14576 вінтовак, 1327 кулямётаў, 27 мінамётаў, 15 гармат 7,5 см [75 мм. – С.Н.], 10 гармат 15 см [150 мм. – С.Н.], 5 гаўбіц 15 см [150 мм. – С.Н.], 3 пяхотных гарматы, 6 зенітных гармат, 46 процітанкавых гармат, 18 іншых гармат (усяго 103 гарматы);

б) коней – 780;

в) аўтамабілі: 36 танкаў і гусенічных цягачоў, прыкладна 1500 аўтамабіляў (у большасці выпадкаў непрыгодных).

Узяты ў палон: 101 афіцэр і 7122 малодшых камандзіраў і радавых. Апрача таго, цяжкія беззваротныя страты рускіх.

У якасці вопыту можна паведаміць.

1. Кароткая, але моцная артпадрыхтоўка не з'яўляецца эфектыўнай у дачыненні да старых умацаванняў з моцнымі цаглянымі сценамі, умацаваныя бетонам, з глыбокімі сутарэннямі і шматлікімі непрагляднымі сховішчамі; патрэбны працяглы карэкціруемы моцны агонь з цяжкіх гармат, каб уздзейнічаць у глыб умацаваных памяшканняў.

Выкарыстанне асобных штурмавых гармат, гармат, танкаў і г.д. абцяжарана непрагляднасцю шматлікіх сховішч бастыёнаў і вялікай колькасцю магчымых цэляў, і не дае чаканых вынікаў з-за трываласці сцен і збудаванняў.

У асобных выпадках да такіх цэляў не падыходзіць цяжкі мінамёт.

Выдатным сродкам для маральнага падаўлення абаронцаў у іх сховішчах з'яўляюцца паветраныя налёты з выкарыстаннем самых цяжкіх бомб.

2. Нечаканае нападзенне на крэпасць, у якой знаходзіцца адчайны абаронца, вымагае вялікай крыві. Гэта простая ісціна зноў даказала сябе ў Брэст-Літоўску. Вырашальным сродкам уздзеяння на праціўніка з'яўляюцца цяжкая артылерыя.

3. Падраздзяленні рускіх змагаліся выключна ўпарта і стойка, паказалі адметную падрыхтоўку пяхоты і шматлікімі прыкладамі даказалі высокі баявы дух.

45-я дывізія вырашыла пастаўленую перад ёй задачу. Панесены цяжкія старты, якія складаюць:

забіта і прапала без вестак – 32 афіцэры і 421 унтэр-афіцэраў і радавых;

паранена – 31 афіцэр і 637 унтэр-афіцэраў і радавых.

Насуперак гэтым стратам і адчайнай смеласці рускіх, цвёрды баявы дух дывізіі, атрымліваючай папаўненне ў асноўным з непасрэднай радзімы фюрэра і вышэйшага галоўнакамандуючага, з вобласці Верхняга Дуная, узорна вытрыманы да апошняга дня крывавых бліжніх баёў.

*Шліпер*

*Поступила в редакцию 14.02.11*

С.Я. Новікаў

ПРАЦОЎНАЯ ЗАНЯТАСЦЬ ЖЫХАРОЎ ГРОДНА Ў 1941–1944 ГГ.

У артыкуле ўпершыню на новай базе дакументальных крыніц паказаны маштабы і вытворчая геаграфія выкарыстання на прымусовых работах жыхароў Гродна. Аўтар аднаўляе агульную карціну працоўнай паўсядзённасці ў акупаваным горадзе, ставячы ў цэнтр увагі мясцовае беларускае насельніцтва, палякаў і яўрэяў, вызначае асаблівасці іх выкарыстання ў прамысловай вытворчасці, гарадской рамеснай гаспадарцы і на работах у нямецкіх фірмах і г.д. На аснове ўвядзення новых дакументальных звестак удакладняецца агульная лічба аб колькасці мясцовага насельніцтва, прыцягнутага да прымусовай працы ў Гродна ў 1941–1944 гг. Аўтар высвечвае новае праблемнае поле па далейшым вывучэнні сацыяльнага становішчы розных працоўных катэгорый і нацыянальных груп з мясцовай рабочай сілы Гродна і Гродзеншчыны.

У найноўшай айчыннай гістарыяграфіі пытанне аб працоўнай занятасці жыхароў Гродна і насельніцтва Гродзеншчыны вядома ў большай ступені праз кантэкст даследавання гісторыі выгану беларускіх грамадзян на прымусовыя работы ў нацысцкую Германію. У канцы 1990-х гадоў у беларускай гістарычнай навуцы ў дачыненні мясцовага насельніцтва, якое з’яўлялася аб’ектам германскай эканамічнай палітыкі.на акупаванай тэрыторыі Гродзенчыны ў 1941–1944 гг,, пачалі ў рэшце абазначацца асобныя навуковыя погляды, адпаведна якім “эканамічны і працоўны патэнцыял горада немцы спаўна выкарыстоўвалі і бязлітасна эксплуатавалі для ўмацавання “трэцяга рэйха” [1, С. 366]. На думку гродзенскага гісторыка Э.С. Ярмусіка, з першых дзён акупацыі мясцовае насельніцтва было пераўтворана ў рабоў [1, С. 367], кажучы інакш – выконвала непасільную рабскую працу.

Паводле статыстычных даных, прыведзеных у гісторыка-дакументальнай хронікі горада Гродна, напачатку трэцяга 1943/44 гаспадарчага года ў горадзе было 38 тысяч жыхароў, з якіх 16 тысяч (ці 42%) былі заняты ў прамысловасці і рамястве [3, С. 366]. Годам раней агульная колькасць занятых на на дзеючых прадпрыемствах горада, аб чым сведчаць звесткі гродзенскай біржы працы, складала 18283 чалавекі, з якіх